ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 30 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 132 (1099) ПАНЯДЗЕЛАК, 9-га чэрвеня 1930 г.

Політычная лінія ЦКК КП(б)Б поўнасьцю адпавядае генэральнай лініі партыі

Заслухаўшы справаздачны даклад т. Калініна аб працы ЦКК КП(б)Б, XIII зьезд КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ўхваляе політычную лінію і практычную дзейнасьць ЦКК КП(б)Б, якая поўнасьцю адпавядае генэральнай лініі нашай партыі.

НА XIII ЗЬЕЗЬДЗЕ КП(б)Б

Непахісна стоячы на варце ленінскай лініі, бязьлітасна змагаючыся на два фронты, ЦК прывёў КП(б)Б да XIII зьезду загартаванай у барацьбе з правай—галоўнай небясьпекай і забясьпечыў сваячасовае выпраўленьне дапушчаных перагібаў у колектывізацыі

Спрэчкі па дакладу тав. ГЕЯ і ВАСІЛЕВІЧА аб рабоце ЦК КП(б)Б

Прамова тав. Фёдарава

Працу друку—пад агонь самакрытыкі

Цэнтральны Камітэт у асноўным сказаў аб сваіх памылках у вядомай пастанове ад 17 красавіка г. г. Ён па-бальшавіцку ўдарыў па канкрэтных носьбітах гэтых памылак — загібшчыках, якія супраціўляліся. Але ён недастаткова адзёргаваў некаторыя акруговыя організацыі, калі яны захапляліся кольвасной колектывізацыяй і абвяшчалі сябе 100-процантнымі па колектывізацыі, калі яны заключалі дагаворы па соцыялістычным спаборніцтве ў справе колектывізацыі і г. д. Трэба сказаць, што і ў нашага Полацкага акруговага камітэту завярцелася ў галаве і ён прыняў няправільную пастанову аб скančэньні колектывізацыі акругі да канца 1930 г. Мне здаецца, што ЦК недастаткова рашуча ўдарыў па акруговым камітэце партыі. Але ня гледзячы на ўсе перагібы і памылкі, пасьля дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б наш Цэнтральны Камітэт у першую чаргу пачаў выпраўляць тыя недахопы, якія мы зрабілі, і зараз ні ў якім выпадку нельга недаацэньваць тых 12 проц. гаспадарак, якія захаваліся ў колгасах. Гэта трэба расцэньваць, як вялізарнейшую перамогу КП(б)Б і як падставу для далейшага разьвіцьця нашага колгаснага руху.

Цэнтральны Камітэт партыі ў гэтым годзе практычна і рашуча паставіў пытаньне аб дапамозе асобным эканамічным і культурным галінам акруг Беларусі.

У гэтым годзе, як ніколі, Цэнтральны камітэт партыі практычна, рэальна вырашыў гэтыя пытаньні зараз. У сувязі з гэтым, праводзіцца рад мерапрыемстваў, якія павінны будуць палепшыць эканамічнае і культурнае становішча асобных акруг, якія ў параўнаньні з іншымі акругамі, зьяўляюцца адсталымі.

Асобныя цэнтральныя нашы органы яшчэ да гэтай пары канчаткова ня вырашылі пытаньня аб тым будаўніцтве, якое павінна праводзіцца ў гэтым годзе.

Яшчэ да гэтага часу, таварышы, няма вызначаных об'ектаў, няма вызначаных месц, дзе будаваць і г. д. А будаўнічы сэзон хутка праходзіць. Калі мы ў гэтым пытаньні з боку ЦК партыі ня будзем мець належнай устаноўкі, якая павінна забясьпечыць адказнасьць нашых пасобных працаўнікоў. нашых цэнтральных ведамстваў, калі мы ня будзем мець сыстэматычнай праверкі тых заданьняў, якія мы маем па выкананьні па раённай палосе і адсталых акругах,—мы зможам мець пагрозу зрыву пасобных мерапрыемстваў.

Другое пытаньне—гэта пытаньне аб ролі нашага друку і кіраўніцтве ім з боку ЦК нашай партыі. Усім нам вядома, што друк праводзіць вялікую работу па дапамозе партыйным організацыям у барацьбе з выкрыцьцём розных памылак, перагібаў і ў разгортваньні самакрытыкі у барацьбе за генэральную лінію партыю. Але трэба сказаць, што вельмі часта нашы газэты дапускаюць асобныя вялікія памылкі і адмаўляюцца ад выпраўленьня гэтых памылак. Я маю на ўвазе газэту „Чырвоная Зьмена“. Гэта газэта яшчэ ў студзені запусьціла вялікую памылку —быў зьмешчаны артыкул пад загалоўкам „Астраханшчына на Полаччыне“. Абвінавачвалі Полацкае акруговае кіраўніцтва ў змазваньні правага ўхілу, у змазваньні чысткі партыі і ў канцы паставілі крыж над рашэньнямі, якія былі вынесены пленумам АК і АКК. Паводле нашага настаяньня ЦК і ЦКК праводзіў агляд Полацкай акруговай організацыі. Праўда, канчатковых вынікаў ЦК па абсьледваньні работы заслухаць не ўдалося, але заслухалі даклад акруговай кантрольнай камісіі і ЦКК, якая праводзіла агляд, а значыла што няма ніякай астраханшчыны. Адначасова ЦКК не паказала газэце—„Чырвонай Зьмене“—аб тым, што нельга ставіць крыж над політычнай рэволюцыяй цэлай акруговай партыйнай організацыі. Мы пасьля вынесьлі сваю пастанову і паслалі артыкул зьмясьціць у друку і па гэтым пытаньні вялі спэцыяльную размову. З тэй пары прайшло шмат часу, але-ж да гэтага моманту, наша пастанова не зьмяшчаецца. Мы ў гэтай пастанове прызналі і рад практычных недахопаў.

Трэба сказаць што газэта „Чырвоная Зьмена“—маленькая але зубастая, газэта добрая яна ставіць рэзка пытаньне.

І яшчэ, таварышы, я хачу зьвярнуць увагу на адну газэту, на газэту „Савецкая Беларусь“, якая ў адным з нумароў зьмясьціла артыкул аб тым, што Полацкая акруга працуе на карысьць кулака. Справа зводзіцца да таго, што ў Менскай акрузе 14 проц. абагуленага насеньня, а па Полацкай—17,3 проц. Таму Полацак працуе на карысьць кулака і з гэтага повадку даецца вялікі аншлаг. Мы пратэставалі супроць гэтага абвінавачаньня і ЦК партыі даў належную з увагу газэце. Я лічу, што трэба крытыкаваць і наш друк.

Прамова т. Жыгуновіча

Больш увагі справе выхаваньня дзяцей

Комсамольская організацыя расьце з кожным днём. Але ёсьць у рабоце комсамолу і шэраг адмоўных фактаў. Комсамольцы ў цэхах часам зьяўляюцца ілжэ-ўдарнікамі. Ёсьць такія факты, калі комсамольцы атрымліваюць прэмію за ўдарніцтва, а потым ламаюць машыну, робяць прагулы і інш. Гэта паказвае што ў цэхах комсамольцамі ня кіруе партыйная організацыя.

Політычны ўзровень нашых комсамольцаў слабы. Гэта тлумачыцца тым, што школы ня былі прыстасаваны да ўзроўню ведаў комсамольцаў. Комсамольцы-малапісьменныя, а іх пасылаюць у партшколу, у той час, калі яны ня ўмеюць чытаць.

Трэба адзначыць, у якіх жыльлёвых умовах жывуць комсамольцы. У нас уся ўвага зьвернута на сямейных, а на адзіночак-комсамольцаў ніякае ўвагі не звaрачваецца. Комсамольцы жывуць у дамох, дзе знаходзяцца пад уплывам рэлігійных бацькоў або гаспадара, і гаспадыні. Да гэтага часу ня было зьвернута ніякай увагі на пабудову для маладняка агульнага памяшканьня.

Аб перабудове комсамольскай работы. Зараз організаваны сэктары, але ячэйкі ня ўмеюць працаваць у іх. Райком і акругком таксама ня ўмеюць кіраваць гэтымі сэктарамі.

У нас ёсьць дзіцячыя організацыі, але на сёньняшні дзень шмат дзяцей ходзяць яшчэ па вуліцах і хуліганяць. Дастатковага выхаваньня сярод дзяцей няма. Бацькі знаходзяцца на працы, а дзіцё прыходзіць з школы і ня мае прытулку. Трэба зьвярнуць увагу на дзяцей. Наша бяда ў тым, што школа не займаецца як сьлед новым політычным выхаваньнем, у пролетарскім духу, дзяцей. Для гэтага трэба адкрываць курсы, прыцягваць туды лепшых таварышоў, лепшых работнікаў, якія-б у будучым далі не старых інтэлігентаў настаўнікаў, а новых.

Прамова тав. Вэндэ

Без самакрытыкі мы ня можам рухацца ўперад

Гомельская організацыя атрымала вялік урок у справе самакрытыкі. Мы ў Гомелі зрабілі рад памылак у справе разгортваньня самакрытыкі. „Соль“ нашых памылак заключаецца ў тым, што несваячасова ўдарылі па апортуністых, якія баяцца самакрытыкі і якія ня толькі ле баяцца, але душылі самакрытыку. Мы сваячасова ня ўдарылі і не заклікалі да парадку гэтых людзей, і ЦК КП(б)Б павінен быў умяшацца для таго, каб узяліся за гэтыя памылкі па-бальшавіцку і пачалі іх выпраўляць.

Я ня згодзен з тав. Мазурам, калі ён гаворыць, што самакрытыка ў нас ужо шырока разгорнута. Мы разгортваем, паглыбляем і прымаем меры да таго, каб кожны рабочы займаўся самакрытыкай, бо для членаў партыі і ўсяе рабочае клясы самакрытыка патрэбна, як паветра, таму што без яе мы ня можам рухацца ўперад, мы ня можам будаваць сацыялізм, без яе мы ня можам выпраўляць свае памылкі. Я павінен сказаць, што калі была вынесена пастанова ЦК і ЦКК, мы ў Гомелі на 100 проц. прызналі нашы памылкі. Трэба сказаць, што ЦК партыі правільна прыняў рад пастаноў і оргвысадаў.

Па лініі колектывізацыі, у адносінах перагібаў, мы сталі на адным з апошніх месц. Па выкананьні прамфінпляну мы таксама, хаця з вялікімі труднасьцямі, спраўляемся з гэтай справай.

Прамова т. Пятушкова

Рашучым экзаменам у далейшай колектывізацыі зьявіцца ўборачная кампанія

ЦК КП(б)Б пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) ва ўсёй сваёй рабоце праводзіў правільную політычную і організацыйную лінію. КП(б)Б за пэрыод ад 12 да 13 зьезду мае вялікія дасягненьні. Рост партыі паказаў, што рабочая кляса ўсьвядоміла нашу генэральную лінію і што лепшая частка рабочае клясы папаўняе рады КП(б)Б. Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) ЦК КП(б)Б вёў рашучую барацьбу на два фронты—з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе соцыялістычнага будаўніцтва, і „левымі“ загібамі, барацьбу супроць нацыянал-дэмократаў. ЦК сваячасова і рашуча павёў барацьбу супроць правых опортуністычных поглядаў т. Чарвякова. У гэтай барацьбе прымала актыўны ўдзел і Менская організацыя і Менскі акруговы партыйны камітэт. Цэнтральны камітэт сваечасова прызнаў дапушчаныя памылкі ў галіне колектывізацыі, ён рашуча і сваечасова выправіў гэтыя памылкі. ЦК рашуча праводзіў лінію па выпраўленьню скажэньняў лініі партыі і дапушчаных загібаў.

Я лічу, што трэба завастрыць увагу вакол далейшага выпраўленьня загібаў, якія дапускаліся організацыямі на мясцох у галіне колектывізацыі. Рашучым экзаменам у далейшай колектывізацыі зьявіцца ўборачная кампанія. Гэта ўборачная кампанія, якую мы будзем мець у нашых колгасах, зьявіцца адзінным доказам для бядняцкіх, серадняцкіх мас, якія не пайшлі ў колгасы, што яны павінны быць у колгасах.

Гаспадарчыя труднасьці высунулі востра проблему разьвіцьця садова-гародніцкай гаспадаркі. Белсадсаюз, які кіруе гэтай справай, скрыўляе лінію партыі. Праводзячы сваю лінію, ён об'ектыўна падрывае колектывізацыю. Калі сёньня колгасьнікі здаюць 2000 гуркоў па расцэнцы 20 кап. шт., дык фактычна яны атрымліваюць ня поўнасьцю, г. зн. 31 проц. ідзе на розныя накладныя расходы, вылічэньні і г. д. Па-мойму, такая політыка павінна быць перагледжана з боку адпаведных парторганаў.

Прамова тав. Каждана

Вынікі соцыялістычнага будаўніцтва—доказ правільнасьці генэральнай лініі

Аб пасьпяховых выніках соцыялістычнага будаўніцтва кажуць першыя вынікі нашай гаспадарчай пяцігодкі, усё больш узрастаючая актыўнасьць рабочых на прадпрыемствах, соцыялістычнае спаборніцтва, пераход на вышэйшыя формы гэтага соцыялістычнага спаборніцтва, —ударніцтва, усё гэта зьяўляецца лепшым доказам правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі па соцыялістычным будаўніцтве.

Цэнтральны камітэт нашай партыі прызнаў свае асобныя памылкі, дапушчаныя ў адносінах колектывізацыі і тым самым правільна орыентаваў парторганізацыі на выпраўленьні гэтых памылак, чым Цэнтральны камітэт паступіў па-бальшавіцку.

Дзеньнік XIII зьезду КП(б)Б

На ранішнім пасяджэньні 8-га чэрвеня працягваліся спрэчкі па дакладу т. Калініна. Выступалі ў спрэчках т. т. *Караленка, Сташэўскі, Эгле, Юзьбік, Жолудзёў, Земнек, Шафранскі, Канакоцін, Ляўкоў, Тамкоў Батва, Зелянкоўскі, Бейлін* і *Курцік.*

Усяго па справаздачы ЦКК КП(б)Б выказалася 36 таварышоў.

На гэтым-жа пасяджэньні заслухана заключнае слова т. Калініна.

Зьезд у аднагалосна ўхваленай пастанове цалкам і поўнісьцю ўхваліў палітычную лінію, і практычную дзейнасьць ЦКК КП(б)Б. Для распрацоўкі рэзалюцыі па справаздачы ЦКК КП(б)Б зьездам выбрана камісія з 37 чалавек.

У канцы ранішняга пасяджэньня да будынку Дому культуры, у якім праводзіць свае работы зьезд, прыбыў чырвоны абоз, арганізаваны калгасьнікамі Самахвалавіцкага раёну, які прывёз 6.000 пуд. бульбы і 500 пуд. збожжа ў падарунак зьезду.

Ад імя колгасьнікаў Самахвалавіцкага раёну зьезд віталі т. т. Будай, Лешын і Давідчык. На прывітаньні колгасьнікаў ад імя зьезду адказваў т. *Чарвякоў.*

На вячэрнім пасяджэньні з дакладамі аб выкананьні пяцігадовага пляну прамысловасьці выступілі т. т. *Бэнэк і Грысевіч.*

Зьезд віталі калгасьнікі Клімаўшчыны тав. *Сідарэнка* (колгас „Камунар Магілеўшчыны) і тав. Раманенка (колгас „Ленінскі Шлях“). На прывітаньні колгасьнікаў ад імя зьезду адказваў т. Хацкевіч.

Пад знакам бальшавіцкай самакрытыкі,

пры максымальным забясьпечаньні ўнутры-саюзнай дэмократыі, праверачы выкананьне рашэньняў аб павароце організацыі тварам да задач соцыялістычнага будаўніцтва—павінна праходзіць падрыхтоўчая і перавыбарчая кампанія

РЭЗОЛЮЦЫЯ

Аб перавыбарах бюро ячэек і камітэтаў ЛКСМБ

1. Апошні Майскі пленум ЦК ЛКСМБ адзначыў, што да гэтага часу, пры некаторым наменціўшымся павароце, няма яшчэ кардынальнага пералому ў бок рашучага павароту работы ЛКСМБ тварам да гаспадарчага будаўніцтва, і ацэнка, дадзеная Цэнтральным Камітэтам УсеЛКСМ і ЦК КП(б)Б, што „работа" і кіраўніцтва комсамолу Беларусі характэрна адставаньнем і неадпаведнасьцю па сваймў тэмпу і зьмесьту тэмпам соц.будаўніцтва ў рэконструкцыйны пэрыод—застаецца ў моцы на сёньня.

Увага комсамольскай організацыі ў час справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінна быць зьвернута на праверку са раўднага павароту твару комсамолу да вытворчасьці, да выкананьня лёзунгу—„весь саюз— дна ўдарная брыгада", на праверку стану кіраўніцтва ўдарніцкім рухам, на ліквідацыю прарываў і недавыкананьня промфінпляну, на барацьбу з стратамі, прагуламі,—за зьніжэньне сабекошту і падвышэньне якасьці продукцыі.

Разам з гэтым, важнейшае месца ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінна заняць праверка ўдзелу комсамолу ў рабоце профсаюзаў, пытаньні выкананьня дырэктыў саюзу аб сумеснай рабоце комсамолу з профсаюзамі, удзелу організацыі і асобных ячэек ў перабудове працы профсаюзаў адпаведна з тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на праводзіруюў сучасны момант справаздачна-перавыбарчую кампанію і профорганаў.

У галіне соцрэконструкцыі сельскай гаспадаркі ўвага організацыі павінна быць завострана на далейшую колектывізацыю бядняцка-батрацкіх і серадняцкіх гаспадарак, у першую чаргу на выпраўленьне прарываў і скажэньняў лініі партыі, меўшых месца ў практыцы колгаснага будаўніцтва, якія рабіліся пад левою фразай, а на справе дапамагалі правааппортуністычным элемэнтам. Работа саюзу на вёсцы павінна быць накіравана на замацаваньне існуючых колгасаў, на організацыю працы ў колгасах, на разьвіцьцё жывёлагадоўлі і сілосаваньне, на організацыю батрацтва і беднаты, на забясьпечаньне своечасовай уборкі ўраджаю. Кожная ячэйка і раён павінны праверыць, што імі было зроблена ў гэтай галіне, як яна організавала моладзь, а ў першую чаргу батрацка-бядняцкую, на выкананьне гэтых задач. Адным з галоўных месц у час перавыбараў павінна быць праверка ўдзелу комсамолу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Вынікі, формы і вопыт праведзенага паходу трохмесячніку за беларускую пролетарскую культуру і культуру нацменшасьцяй павінны быць абагульнены ў сыстэму і штодзённую працу комсамольскай організацыі, удзяліўшы асаблівую ўвагу мобілізацыі мас комсамольцаў на барацьбу з клясава-варожай ідэолёгіяй на культурным фронце, з рознага роду шовінізмам, асабліва з беларускім нацыянал-дэмократызмам. Неабходна павесьці рашучую барацьбу з наяўнасьцю ў некаторай частцы організацыі, асабліва з боку актыву, значэньня нацыянальна-культурнага будаўніцтва і беларусізацыі.

Віднае месца ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінна заняць пытаньне культурна-палітычнага выхаваньня і тэорэтычнай вучобы. Неабходна заастрыць увагу організацыі на гэтыя пытаньні, асабліва популярызуючы рашэньне ЦК УсеЛКСМ, які гаворыць „Бяручы яшчэ больш жорсткі курс на паляпшэньне соцыяльнага складу актыву, на павялічэньне пролетарскай праслойкі ў ім, мы павінны прад'явіць запатрабаваньні да актыву, у першую чаргу быць тэорэтычна падрыхтаваным, сыстэматычна працаваць над падвышэньнем свайго тэорэтычнага ўзроўню.

Самакрытыка ў штодзённай працы комсамольскай організацыі, ня дзейнасьці таму надыходзячая справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек, як і камітэтаў ЛКСМБ, павінна праходзіць пад лёзунгам шырокага разгортваньня пролетарскай самакрытыкі, рашучага ўскрыцьця недахопаў і звычын, якія перашкаджаюць нармальнаму разьвіцьцю організацыі і мобілізацыі энэргіі комсамолу на выкананьне задач па соцыялістычнаму будаўніцтву пад лёзунгам барацьбы за чыстату ленінскай лініі, даючы сакрушальны адпор усялякаму опортунізму, як „левым" агібшчыкам, якія зьяўляюцца адрыжкай троцкізму, так і опортунізму з права, як галоўнай небясьпецы на даны пэрыод.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна стаць генэральнай праверкай выкананьня пастаноў Студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ ва ўсіх галінах дзейнасьці ЛКСМБ перабудовы работы комсамольскай організацыі, прыстасаваньня яе зьместу і тэмпаў да зьместу і тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Перавыбарчая кампанія павінна яшчэ з большай рашучасьцю завастрыць увагу камітэтаў і ячэек на ўзмацненьню пролетарскага асяродку ў ЛКСМБ. Праца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы патрабуе павышэньня клясавай баяздольнасьці комсамолу, накіраваная да пасьпяховага выкананьня пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і апошніх пастаноў пленумаў Цэнтральных камітэтаў комсамолу.

2. Прайшоўшыя перавыбары бюро ячэек ЛКСМБ далі некаторае павялічэньне пролетарскай праслойкі ў агульным складзе бюро ячэек па ўсёй Беларусі. Аднак, у 50 проц. акруг мела месца паніжэньне пролетарскага ядра, так: панізіўся процант рабочых у складзе бюро ячэек па Менскай акрузе на 0,5 проц., па Бабруйскай акрузе на 3,5 проц., па Мазырскай — на 2,8 проц. і па Полацкай—на 0,3 проц. і ў складзе сэкратароў ячэек па Бабруйску—на 3,7 проц., па Мазыру—на 6,4 проц. і па Магілеўскай акрузе на 1 проц.

Пры агульнай здавальняючай пролетарскай праслойцы ў складзе бюро, пленума АК і сэкратароў РК, яўна кепскі соцыяльны склад сэкратароў РК па Магілеўскай і Аршанскай акругах, нязначная колькасьць батракоў на кіруючай рабоце і амаль што адсутнасьць батракоў на кіруючай акруговай рабоце (усяго 2 чалавекі), вельмі нізкая пролетарская праслойка сярод піонэрскіх працаўнікоў і агітпроп. працаўнікоў, амаль што няма на кіруючай раённай і акруговай рабоце дзяўчат (маецца толькі 5 сэкратароў РК). Узрост склад кіруючага актыву вельмі нездавальняючы. Усё гэта гаворыць за тое, што:

а) Да гэтага часу яшчэ ў некаторых акругах (Магілеў, Ворша) сдаацэньваюць значэньня забясьпечаньня адпаведным пролетарскім ядром кіраўніцтва комсамолу.

б) Да гэтага часу не вядзецца праца па выхаваньню і высоўваньню батрацтва на кіруючую комсамольскую работу. Далёка яшчэ ня зьнішчана баязьнь высоўваць дзяўчыну на кіруючую комсамольскую работу і завала ў высоўваньні актыву. Паэтаму, вынікам перавыбарчай кампаніі павінна быць палепшаньне соцыяльнага складу кіруючых органаў зьнізу даверху, павялічэньне дзяўчат на кіруючай комсамольскай рабоце, палепшаньне ўзроснага складу актыву, шляхам сьмелага высоўваньня на кіруючую работу ў комсамоле маладога актыву.

3. Устанавіць наступныя тэрміны перавыбараў: справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек—з 16 чэрвеня па 15 ліпеня, Райкомаў і акругкомаў—у ліпені месяцы прычым перавыбары бюро вытворчых ячэек праводзіць пасьля перавыбараў фабзаўмясцкомаў.

4. Да перавыбараў трэба правесьці шырокую самаправерку работы і справаздачнасьці камітэтаў і ячэек з шырокім прыцягненьнем працоўнай моладзі—некомсамольцаў, дзеля гэтага ўстанавіць наступны парадак правядзеньня падрыхтоўкі да перавыбараў:

а) У ячэйцы 1) узаемная праверка работы ячэйкі ячэйкай з колектыўным складаньнэм пляну абсьледваньня і папярэднім абгаварэньнем вывадаў і вопыту работы на сходах ячэйкі, якая ўзялася абсьледваць. 2) даклады ячэйкі аб рабоце на сходах моладзі, як у горадзе, так і ў вёсцы, 3) практыкаваць на вытворчасьці абсьледваньне ячэйкі ячэйкай узаемазалежных цэхаў і заводаў. 4) устанавіць, як правіла, абсьледване савецкіх ячэек вытворчымі ячэйкамі, а таксама і савецкіх. 5) да гэтага трэба правесьці шырокую популярызацыю дзейнасьці ячэек праз насьценгазеты, дыяграмы і г. д.

б) у раёне: 1) самаабсьледваньне раёнаў па асноўных пытаньнях комсамольскай работы, організацыя культурна-масавай работы, кіраўніцтва соцспаборніцтвам, колектывізацыяй і г. д. складаючы па кожнаму пытаньню брыгады. 2) абавязкова справаздачнасьць РК у большасьці ячэек.

у акрузе: 1) шырокая справаздачнасьць па раённых конфэрэнцыях вытворчых, гарадзкіх і вясковых ячэек. 2) Скарыстаньне акруговага і цэнтральнага друку для абгаварэньня становішча акруговай організацыі. 3) абавязаць комсамольскі друк распачаць ужо зараз шырокае асьвятленьне падрыхтоўкі да перавыбарчай кампаніі і забясьпечыць дастатковае асьвятленьне ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі. 4) абавязаць усе організацыі пры правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі забясьпечыць правядзеньне шырокай пролетарскай самакрытыкі і ўнутры—саюзнай дэмократыі. Папярэдзіць, што малейшае парушэньне прынцыпаў ўнутры—саюзнай дэмократыі, ці малейшы заціск самакрытыкі пацягне за сабой адмену перавыбараў.

Устанавіць, як правіла, што ў пролетарскіх раёнах і ячэйках ніякіх папярэдніх сьпісаў з намечанымі кандыдатурамі ў складзе камітэту ці бюро ячэйкі ня высоўваецца. Выстаўленьне-ж сьпісаў дапускаецца толькі на раённых конфэрэнцыях непролетарскіх раёнаў і акруговых конфэрэнцыях пры абавязковым пэрсанальным галасаваньні, акрамя гэтага выстаўленьне сьпісу, ні ў якім выпадку не адменяе права кожнага дэлегата даць у сьпіс патрэбныя па яго думцы кандыдатуры.

Аб комсамольцах, якія дэзэртуюць з колгасаў

Да вынікаў майскага пленуму ЦК УсеЛКСМ

У сувязі з адлівам з колгасаў, у выніку дапушчаных перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі ў колгасным руху, мы мелі выпадкі выхадаў з колгасаў комсамольцаў. Дзе-ні-дзе на мясцох гэта дэзэртырства комсамольцаў з колгасаў прымала наватмасавы характар. Факты выхадаў комсамольцаў з колгасаў сустракаюцца і да гэтага часу.

Зусім відавочна, што гэта зьявішча ў першую чаргу сьведчыць аб крайняй слабасьці выхаваўчай работы ў вясковых ячэйках комсамолу. Выхад комсамольцаў з колгасаў бязумоўна гаворыць аб тым, што данная ячэйка ня здолела яшчэ выхаваць у комсамольцы актыўнага барацьбіта за колгасную будоўлю.

Факты выхаду комсамольцаў з колгасаў сыгналізуюць таму неабходнасьць максымальнага ўзмацненьня выхаваўчай работы ў вясковых ячэйках Саюзу.

Разам з тым дэзэртырства комсамольцаў сьведчыць аб наяўнасьці ў нашых шэрагах няўстойлівых, хістаючыхся комсамольцаў, якія пападаюць на вудачку кулакоў, агітуючых за развал колгасаў. Факты гэтых выхадаў сьведчаць таксама аб тым, што ў комсамоле ёсьць яшчэ элемэнты і проста варожыя колгаснага руху, якія граюць у ячэйках ролю падкулачнікаў.

Вось чаму кожны факт выхаду комсамольца з колгасу патрабуе пільнай увагі да кожнага комсамольца і да становішча данай ячэйкі.

Між тым, у момант зьяўленьня фактаў дэзэртырства, некаторыя організацыі саюзу замяшаліся і дапусьцілі шэраг памылак.

З аднаго боку пладом гэтай замяшанасьці зьявіліся пасыўнасьць некаторых ячэек і камітэтаў у барацьбе з дэзэртырствам, а дзе-ні-дзе і простая патачка выхадам.

Гэтая-ж замяшанасьць прывяла некаторыя камітэты і ячэйкі саюзу да панікі, да выкіданьня агульнага лёзунгу: „Па-за колгасам—па-за комсамолам!", да заклiку безадкладна выключаць з комсамолу ўсіх комсамольцаў, якія вышлі з колгасаў. У выніку такой „ваўзятай" устаноўкі некаторыя райкомы Сярэдняй Волгі выключылі з комсамолу адразу 150 чал.

У рашэньні апошняга майскага пленуму ЦК УсеЛКСМ абвешчана рашучая барацьба супроць гэтых двух шкоднейшых крайнасьцяй у барацьбе з дэзэртырствам комсамольцаў з колгасаў.

Перад усім пленум падкрэсьліў, што „Лёзунг аб 100-процантным ўцягненьні комсамольцаў вёскі ў колгасы набывае на даным этапе выключна важнае значэньне. ЦК падкрэсьлівае неабходнасьць для кожнага комсамольца актыўна ўдзельнічаць у соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі і ўпарта працаваць на ўцягненьне ненью сваё сям'і і сялян у колгасы. Кожны комсамолец вёскі павінен быць у колгасе, і гэта патрабаваньне ў першую чаргу павінна быць выканана комсамольцамі-домагаспадарамі".

Трэба ўпарта выкрываць няправільныя разважаньні некаторых комсамольцаў аб тым, што „уступленьне ў колгас,—як піша т. Сталін, справа добраахвотная, а раз так, дык я хачу—уступаю ў колгас, хачу—не, гэта мая асабістая справа".

Бясспрэчна, што ўваход у колгас для кожнага бедняка, батрака і серадняка—справа зусім добраахвотная. Але для комсамольца, які з'яўляецца членам пролетарскай комуністычнай організацыі, уступленьне ў колгасы—справа бязумоўна абавязковая, бо інача ён ня будзе па сутнасьці, комсамольцам—будаўніком соцыялізму.

Вось чаму трэба стварыць у комсамоле атмасфэру самага рашучага агульнага асуджэньня факта выхаду комсамольцаў з колгасу. Усе выпадкі падобнага дэзэртырства павінны атрымаваць ад ячэек самы суровы адпор.

Трэба безадкладна выключаць з комсамолу людзей, варожых колгасу і будаўніцтву і разбураючых яго.

Калі той ці іншы паўнапраўны комсамолец або комсамолец-домагаспадар зусім сьвядома для себя выходзіць з таго колгасу, які замацаваўся і працягвае існаваць, дык факт гэтага выхаду трэба разглядаць як праяву простай варожасьці да колгаснага будаўніцтва. ЦК УсеЛКСМ у сувязі з гэтым падкрэсьліў, што ў раёнах суцэльнай колектывізацыі, як правіла, далейшае прабываньне ў комсамоле тых, хто вышаў з колгасаў, зьяўляецца немагчымым.

Калі колгас у выніку перагібаў развалiўся цалкам, дык трэба, безумоўна, выключыць з саюзу тых комсамольцаў, якія ня толькі не змагаліся за захаваньне і замацаваньне колгасу, а наадварот, шкодзілі колгасу, дабіваліся яго развалу. Такія комсамольцы праявілі сябе ворагамі колгасу, саюз павінен безадкладна ачысьціцца ад іх.

Але пры вырашэньні пытаньня аб далейшым прабываньні ў комсамоле кожнага вышаўшага з колгасу комсамольца патрэбен самы дакладны ўлік мясцовых умоў. Трэба памятаць, што галоўнымі мэтадамі існаваньня лёзунгу 100-процантнага ўцягненьня комсамольцаў у колгасы зьяўляецца мэтад выхаваўчага ўзьдзеяньня, мэтад перакананьня і перавыхаваньня.

Нельга гэты выхаваўчы процэс падмяняць вокрыкам, загадам зьверху і голым адміністраваньнем.

Нельга агулам залічаць кожнага комсамольца, які вышаў з колгасу, у ворагаў колгаснага руху і выключаць з комсамолу.

Асабліва ўважліва трэба падыходзіць да выключэньня батракоў і беднякоў-комсамольцаў, вышаўшых з колгасу. Ім трэба дапамагчы ўсьвядоміць сваю памылку і зьвярнуцца ў колгас.

Пры гэтым трэба таксама ўлічваць гаспадарчае месца комсамольца ў сям'і. Комсамолец-домагаспадар павінен у першую чаргу быць у колгасе. Для комсамольца-члена сям'і яго праца па ўцягненьню сям'і ў колгас зьяўляецца экзаменам яго ўменьня комуністычна ўплываць на акаляючых, праверкай яго настойлівасьці ў барацьбе за колгас. Перад комсамольцамі вёскі стаіць задача ўцягненьня ў колгас сваіх сем'яў, прычым у раёнах суцэльнай колектывізацыі, калі сям'і пасьля самых вычэрпваючых перакананьняў усё такі адмаўляецца ісьці ў колгас дык у такіх выпадках комсамолец павінен дабівацца разьдзелу і самастойна ўступіць з сваёй часткай гаспадаркі ў колгас.

Настойлівае і ўпартае правядзеньне задачы стопроцантнага ўцягненьня комсамольцаў у колгасы, пры строгім ўліку мясцовых умоў і пры асноўнай стаўцы на выхаваньне, растлумачэньне і перакананьне, а ня вокрык і агадванае — вось задача вясковых організацый нашага саюзу.

С. Калесьнічэнка.

Ствараем брыгады

Наркомпрацы ўнёс прапанову ў ЦСПСБ аб організацыі брыгады па праверцы падрыхтоўкі кадраў гаспадарчымі організацыямі. Будуць праверваны ВСНГ, Белкоопсаюз і некалькі трэстаў. Мэта брыгады—праверыць наколькі адпаведныя організацыі выконваюць дырэктывы аб кадрах.

14 корпусаў Чырвонай арміі—узброеная сілы кітайскай рэволюцыі

Вялізарная тэрыторыя з насельніцтва каля 100 мільёнаў чалавек гарыць у агні партызанскай барацьбы, у авангардзе якой стаяць 14 карпусоў Кітайскай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

Кітайская Чырвоная армія, як узброеная сіла кітайскай компартыі і савецкай улады ў Кітаі пачала організоўвацца яшчэ ў лістападзе 1927 году, калі ў Хайлуфіне, недалёка ад Кантону, была організавана савецкая ўлада.

Чатыры месяцы абаранялі чырвоныя войскі маленькую савецкую рэспубліку супроць колькасна ў некалькі раз большых сіл праціўніка і нарэшце, прымушаны былі яе пакінуць.

На мяжы правінцыі **Хунань** і **Цзянсі**, у горах і лясох заселі чырвонаармейцы, умацаваўшыся ў сваёй базе—горнага ланцугу Цзінганшань.

Яны працягвалі і тут, у прылягаючых да Цзінганшаню паветах, змагацца з панамі, організоўваць саветы, ажыцьцяўляць аграрную рэволюцыю.

Гіганцкая хваля масавага рэволюцыйнага руху, якая пачалася ў 1930 годзе, у выніку якой сялянскія партызанскія атрады, якія называлі сябе атрадамі Чырвонай арміі і чырвонай гвардыі, сталі шпарка расьці і множыцца, паставіла на чаргу дня новую задачу—**пераформіраваць і зьвязаць у адно цэлае, усе гэтыя ўзброеныя сілы рэволюцыі.**

Гэта было зроблена ў красавіку 1930 году. Замест трох карпусоў кітайскай Чырвонай Арміі, якія існавалі ў 1928 і 1929 г. г. у сучасны момант мы маем 21 **корпусоў.**

Гэтыя карпусы раскіданы па ўсёй тэрыторыі, ахопленай партызанскай вайной у Кітаі.

Па вестках, якія паведамляюцца нелегальнай газэтай „Хунцы", штодзённым органам ЦК кітайскай компартыі, кітайская Чырвоная Армія у сучасны момант налічвае ў сваіх шэрагах **больш 60 тысяч байцоў, з якіх дзьве трэці ўзброены вінтоўкамі.**

Кітайская Чырвоная Армія сама па сабе зьяўляецца вельмі ўнушаючай баявой сілай, але моцная яна, галоўным чынам, сваёй сувязьзю з насельніцтвам, спачуваньнем сялянскіх мас. Кітайскія сяляне ведаюць, што Чырвоная Армія—гэта Армія працоўных, што яна змагаецца супроць эксплёатуючых і паноў, буржуазіі і генэралаў. Іменна гэта робіць Кітайскую Чырвоную Армію **непераможнай**, ня гледзячы на ўсе захады рэакцыйнага Нанкінскага ўраду.

Кітайская Чырвоная армія, усюды, дзе яна паяўляецца **конфіскуе панскія землі і рыс** і раздае іх сялянам, працуе па лініі ўтварэньня саветаў, узбройвае сялянскія атрады Чырвонай гвардыі, абвяшчае васьмігадзінны працоўны дзень, павышае зарплату батракоў і рабочых.

За апошнія месяцы тэлеграф амаль штодзённа прыносіць весткі аб новых і новых перамогах кітайскай Чырвонай арміі; адзін за другім займае яна павятовыя гарады і буйныя гандлёвыя цэнтры і сьледам за ёй высока ўздымаецца хваля сялянскіх паўстаньняў.

Кітайская Чырвоная армія, верная апора ўзьнімаючыхся на барацьбу мільённых мас кітайскага народу, бясспрэчна, зьяўляецца адным з важнейшых фактараў рэволюцыйнага руху ў Кітаі.

Вішнякова.

СУПРОЦЬ САМАТУЖНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

Індывідуальнае і брыгаднае вучнёўства яшчэ захавалася на некаторых фабрыках і заводах, гэтыя кадры ня могуць забясьпечыць растучыя патрэбы прамысловасьці

ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ І БРЫГАДНАЕ ВУЧНЁЎСТВА ПАВІННА БЫЦЬ ЗЬНІШЧАНА Ў БОК ПАШЫРЭНЬНЯ СЕЦІ ФЗВ І ПРАХОДУ ЎСЁЙ БРОНІ ВЫКЛЮЧНА ПРАЗ ФЗВ, ЯК АСНОЎНУЮ ФОРМУ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

Супроць саматужнасьці і бясплянавасьці

Да гэтага часу яшчэ захаваліся на шмат якіх заводах і фабрыках старыя формы падрыхтоўкі кадраў, як брыгады, так нават і індывідуальнае вучнёўства, і вучнёўства наогул бяз плянаў і напрамкаў.

Гэтая пастаноўка вучнёўства ня можа забясьпечыць нашу прамысловасьць патрэбнымі кадрамі, гэтыя брыгады і формы індывідуальнага навучаньня рыхтуюць людзей тымі-ж формамі, якімі выхоўваліся кадры для саматужнай прамысловасьці.

Дрэнная пастаноўка вучнёўства, якая існуе да гэтага часу, калі вучняў не дапускаюць да варштату, калі інструктары займаюцца ўсімі справамі толькі не падрыхтоўкай кадраў, сьведчыць нам аб тым, што гэтая сыстэма на сучасны момант ні ў якім разе сябе не апраўдвае, што яна павінна быць карэнным чынам зьменена ў бок рэалізацыі пастановы пленуму ЦК УсеЛКСМ аб тым, што ўся броня павінна праходзіць праз школы ФЗВ. Гэтая работа павінна праходзіць разам з палепшаньнем становішча ФЗВ і далейшым пашырэньнем сеткі школ ФЗВ.

Прамысловасьці патрэбны кваліфікаваныя кадры, але гэтыя кадры павінны прыйсьці на завод ня з звычкамі дробных саматужнікаў, а ўсебакова разьвітыя, клясава-вытрыманыя рабочыя для соцыялістычнай прамысловасьці.

Програма навучаньня ня выконваецца

На заводзе „**Бальшавік**“ *(Менск) справа з падрыхтоўкай кваліфікаваных кадраў пастаўлена дрэнна. Аб гэтым сьведчыць становішча вучнёўства на заводзе.*

У школе ФЗВ працуюць 23 чалавекі з агульным тэрмінам навучаньня у 3 гады. Гэтыя тры гады разьмеркаваны такім чынам, каб за першы пэрыод навучаньня, у пару гады, вучань мог азнаёміцца з ўсімі процэсамі работы цэхаў і ў другі пэрыод змог вызначыцца ў пэўны цэх.

На справе гэта програма ня выконваецца, і вучні доўгі час стаяць на адной і тэй самай процы, ке набываючы патрэбнай усебаковай кваліфікацыі. Вельмі часта вучняў скарыстоўваюць на чорнай рабоце, прымушаюць цягаць скуру і выконваць самую простую, безадказную працу.

Вельмі часта вучні стаяць звыш году на такой працы, як раскрой конскіх скур і зусім не знаёмы з больш адказнай працай, як разьметка.

Комсамольская організацыя заводу некалькі раз уздымала пытаньне аб гэтым перад адпаведнымі партыйнымі профсыйнымі організацыямі, але апошнія ня прынялі належных захадаў з тым, каб палепшыць становішча вучнёўства на заводзе і стварыць патрэбныя ўмовы для падрыхтоўкі кадраў.

МІНКІН З.

Не падрыхтаваліся да асеньняга набору

Надыходзіць чарговы асеньні набор у школы ФЗВ. Праведзены гэтымі днямі налёт „лёгкай кавалерыі“ на Віцебскі акрплян і акруговы інспэктарыят Наркамасьветы выявіў поўную адсутнасьць падрыхтоўчай работы да набору. Памяшканьня ў пяці фабзавучах мэталістых, харчавікоў, будаўнікоў, і фабзавучы „Дзьвіны“ няма. Такім чынам, адзін гэты факт пагражае зрыву набору, у які павінна быць прынята звыш 600 чалавек.

З боку ВСНГ і Белдзяржбуду праяўлен яўны бюрократызм і цяганіна з водпускам сродкаў на пабудову памяшканьня будвучу. З-за адсутнасьці памяшканьня, заняткі ў гэтым фабзавучы прышлося спыніць раней на месяц, чым быў сарваны вучэбны плян. Аб гэтым у свой час АК ЛКСМБ і загадчык фабзавучу паведамлялі ВСНГ і Белдзяржбуд. Ведае аб гэтым дырэктар Белдзяржбуду **тав. Васэрман** і **тав Гіжгорн**—інжынэр ВСНГБ, якія нядаўна самі былі ў школе і ўпэўніліся ў гэтым. Апрача таго, што выказалі спачуваньне, нічога не зрабіл.

Ня лепш абстаіць пытаньне і ў фабзавучы маталістых. Мяркуецца ў новы набор прыняць 150 чалавек. Тымчасам, памяшканьне яшчэ не падрыхтавана. Ды наогул у наступным годзе фабзавуч застанецца без памяшканьня, бо з памяшканьня Політэхнікуму, дзе знаходзіцца школа зараз іх высяляюць, а новага памяшканьня не даюць, ня гледзячы на тое, што ёсьць пастанова гарсавету аб водпуску памяшканьня ў адным з Жактаў, які знаходзіцца побач з Політэхнікумам.

Такое становішча наглядаецца ў фазавучах; краўцоў, панчошнікаў, і ФЗВ фабрыкі „Дзьвіна“. Час ня церпіць. Трэба прыняць усе захады каб не дапусьціць зрыву асеньняга набору.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ **Бэрнштэйн.**

Без дапамогі і кіраўніцтва

На шкло-заводзе „Ноўка“, а нават і на ўсіх заводах, якія выпрацоўваюць лямпавае шкло, не хапае рабочых шкло-дуваў. Гэты недахоп павялічыўся яшчэ большы ў сувязі з пераводам вялікай колькасьці заводаў на бесьперапынны рабочы тыдзень. З кастрычніка гэтага году пераходзіць на бесьперапынны рабочы тыдзень і гута „**Ноўка**“, у сувязі з гэтым ёй неабходна будзе 20 кваліфікаваных мастраў шкло-дуваў.

Раней падрыхтоўка рабочых кадраў для шкляной прамысловасьці праводзілася індывідуальным парадкам, зараз у „Ноўках“, у выглядзе вопыту, устаноўлен варштат брыгаднага вучнёўства, на якім зараз падрыхтоўваюцца 8 шкло-дуваў і 4 банячніка.

Заводакіраўніцтва, падпісаўшы колумову, у якой быў прынят пункт аб організацыі брыгаднага вучнёўства, доўгі час тармазіла справу організацыі гэтай брыгады і зараз ня ідзе насустрэчу ў яе працы.

Ні комсамольская ячэйка, ні вучком ня кіруюць працай брыгады, не дапамагаюць у справе разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва. Брыгада працуе самацёкам, па волі хваль, як нейкая бяспрытульная на шкло - заводзе „Ноўка“.

Рабочы.

Перавялі,—а далей?..

У сувязі з недахопам кваліфікаваных токараў на заводзе „Энэргія“ вучні з сьлясарнага аддзяленьня былі пераведзены ў такарны цэх. З пераводам на варштат ім у першыя дні паказалі працу, але далей пусьцілі бяз усякага кіраўніцтва. Работу ім даюць якую папала—усякія дробязі, тады як ім можна даручыць больш складаную і адказную працу.

Справа ў тым, што інструктары выконваюць працу майстраў і наогул адміністрацыйную і ня цікавяцца сваёй конкрэтнай працай. Калі вучань або ЦІП'авец пытаецца ў інструктара, як лепш і хутчэй апрацаваць дэталь, інструктар **Гавановіч** размахвае рукамі і выходзіць. Такая пастаноўка вучнёўства ня можа даць жаданых вынікаў, бо **Гавановіч** і яму падобныя не навучаюць, а трымаюць усе свае веды ў сакрэце.

Вучням прыходзіцца зварочвацца з запытаньнем да паасобных рабочых, але апошнія, у сваю чаргу, не заўсёды жадаюць адказваць, і цэлы шэраг пытаньняў вытворчасьці для вучняў застаецца нявысьветленым.

На ціпаўцаў мала хто зварочвае ўвагі. Іх ставяць да варштату, даюць працу, а далей—рабі, як можаш. У выніку—**шмат браку і дрэнная якасьці прадукцыя.**

Такая пастаноўка **навучаньня, бязумоўна, ня можа даць патрэбных вынікаў**, і пытаньне **падрыхтоўкі** кадраў для **мэталёпрамысловасьці** ня будзе вырашана **да таго часу**, пакуль канчаткова **ня будзе зьменена** форма падрыхтоўкі **кадраў** і конкрэтна ня будзе **організаваны** адпаведны ФЗВ.

Токар.

Лепшыя ўдарнікі ў партыю Леніна

На здымку комсамольцы пішуць заявы аб прыеме іх у партыю.

ЛІСТ З РЫШТАВАНЬНЯЎ

„Як гэта робіцца?“

Старыя могілкі, зрытыя, усеяныя каменьчыкамі, узгоркам, ляглі нейкім пустыром, побач з камяніцамі, з самым гушчарам гаразкога шуму, загароджаныя нізенькім драўляным плотам і сваёй маўклівасьцю падкрэсьлівалі ўсю недарэчнасьць, папярэдніасьць абранага месца.

Ці тут быць пустыру? Памылка выпраўлена.

Натугамі організаваных соцень простараў штодня мяняўся твар пустыру. Варшыню ўзрылі моглілі не для пахаваньня, а для нараджэньня. Рылі, капаван. Вазілі цэглу, каменьне. З часам выраталі сьцен фундаманту, расьлі і расьлі ўвыш.

Там, дзе была пустэча, вырасьлі гаспадарныя шматпавярховыя, аплецены павуціною рыштаваньняў, карпусы-волаты. У 6 днях працы неўзабаве у падвалі дамы пад крышу. З аднаго канца даваўся сякера па бляхах, з другога—звонка калываліся малаткі бляхароў.

Працавалі дружна, гуртам.

Адны вазілі вапну, другія зьмешвалі з пяском, трэція тынкавалі. Прыходзілі маляры за імі манцёры, стапяры. Вось гэтак, дапамагаючы адзін аднаму, працавалі. Бралі бальшавіцкія тэмпы працы.

Так был пабудаваны чатыры карпусы ўнівэрсытэцкага гарадка: мэдыцынскі, анатамічны, прыродазнаўчы і хімічны.

А пяты—галоўны аўдыторны корпус яшчэ толькі напалову скінуў сваё адзеньне рыштаваньняў.

Тут—гарачая ўпартая праца.

Пабудову скончыць да вызначага тэрміну! За гэта трэба змагацца. Праца ўжо па выходзіць да канца.

Скончана ўстаноўка паветранага ацяпленьня. Роўнымі, па ўзьдзіў падобнымі адна да аднэй дошчачкамі кладзецца паркет, бліскучай роўніцай пакрываецца квадратура пакояў, доўгіх сьветлых калідораў.

Праводзяць электрычнасьць.

Тынк даўно ўжо пакрыў чырвоныя цэглы.

Фасад атынкаваны толькі з аднаго боку.

З другога толькі пачынаюць. Тут будзе нязвычайны, сьлепячы сваёй ідэальнай бязьмежнай роўніцай вочы, тынк, які нечакана для вока абрываецца ля х ду а там за ім, мусіць, ідзе далей. Так здаецца, калі глядзець на яго пільна прыхіліўшы да сьцяны і, заплюшчыўшы адно вока, другім бегчы ўвыш па роўным тынку.

Ён будзе блішчэць маленькімі крупінкамі каменнага вугалю і бліскучага мармуру, будзе пераліваціца рознакаляровым променем сьвету.

Праца вельмі складаная. Яна патрабуе шмат ведаў і спрактыкаванасьці. Нашыя менскія тынкары ня ўмеюць рабіць гэткага тынку, і таму адміністрацыя пабудовы ўнівэрсытэцкага гарадка мусіла выпісаць тынкароў спэцыялістых з Масквы.

Прыехалі маскоўцы.

Тыя, што яшчэ ўчора трэсьліся ў вагонах, сёньня рассыпаліся па рыштаваньнях і прыліплі да роўніцы каменных сьцен. Ля самага корпусу вырас драўляны хлеў, у які пачалі звозіць цяжкі мяхі размолатага мармуру, вугалю і цэмэнту.

Абсталёўвалі майстэрні.

Прыходзілі людзі, глядзелі, дзівіліся на бліскучыя каменьчыкі белага мармуру, бралі яго на вобмацак, перасыпалі з рукі на руку, на сьвятле і ў цені, цікавіліся, пыталі прыезджых маскоўцаў:

— Я-ж-жа гэта ён на сьцяну ляжа? Цікава!

А ў адказ—ухмылка майстра.

— А так,—з мяха ды на сьцяну, а калі цікава—убачыш, як гатова будзе. Гэта вось штука хітрая, адразу ня ўцяміш.

І больш нічога. І так кожнаму, хто прыходзіў і цікавіўся. Майстар рабіў з гэтага нейкую патаемнасьць.

Аднойчы зайшоў менскі „тутэйшы“ тынкар. З зацікаўленасьцю наглядаў за процэсам падрыхтоўкі саставу для тынку з мармуру, вугалю і цэмэнту.

У другі раз ён прышоў з скрынкаю.

— Можна ўзяць трохі мармуру і вугалю?—запытаў ён майстра.

— Што-ж-бярэце. Але навошта яны вам?

— А так, па прабуем.

— Прабуйце, прабуйце, калі ня шкода вам дарэмнай працы. Усёроўна нічога ня выйдзе. Гэта штука хітрая, адразу ня ўцяміш.

На гэтым гутарка канчалася.

У ім гаварыў майстар, які імкнецца захаваць сакрэт сваёй працы.

Але, як на зло,—усе нібы-та толькі і хацелі, спакушаліся пазнаць „як гэта робіцца“. Прышлі два маладыя хлопцы тынкары—комсамольцы.

— Хай вучацца, прыглядаюцца—сказаў прараб, які прышоў разам з імі. І вышаў. Хлопцы засталіся.

„Старшой“ арцелі ня зусім ветла прыняў іх.

Хай прыглядаюцца...

І пашлі аднастайныя дні працы. Штодня ад 7-ай гадзіны сыпалі ў скрыню мармур, вугаль, цэмант. Уважліва пачылі колькі, куды сыпаць. Больш глядзелі, чым пыталі.

Яны—маладыя хлопцы, поўныя энэргіі. Яны хочуць вучыцца, гэтага вымагае маладосьць.

Не глядзець на скрыні, поўныя шэрай аднастайнай масы, ня ведаючы, не разумеючы яе складу, а штодня вабываць веды,—учыцца і знаць.

Гэта іх імкненьне ўпарта стрымлівалася майстрам, разьбівалася аб сьцяну маўчанкі, нежаданьне навучыць, паказаць.

Аднойчы праца па нарыхтоўцы масы спынілася. Тынкары ледзьве пасьпявалі выкарыстоўваць нарыхтаваную масу.

Была вольная часіна, спынілася напружаная праца, у хляве асядаў цэмэнтовы пыл.

— Закурвай, хлопцы!

— А мы хочам пайсьці на накідку. Ці можна?—Запыталі хлопцы ў майстра.—Нельга, хлопцы! Гэта праца складаная і адказная. У нас людзі па тры гады вучыліся. Год папрацуе па падносцы матар'ялаў, каб плячыма, гарбом сваім адчуць цяжар працы і толькі тады нясьмела пачынае спрабаваць; кіне разок кельмай на сьцяну, тады ўжо робіцца падручным пры майстры. Падаць тое-сёе!

Гады, хлопцы, трэба—гады навучаць! Не, хлопцы, нельга!

Падмяцеце, хлопцы, майстэрню, каб чыста было, бо надта ўжо многа бруду набралася.

* * *

З аднаго боку корпусу спрытна, жвава працуюць 23 „масквічы“. Сьцены паступова пакрываюцца пачётам прыгожага бліскучага тынку.

З другога боку таго-ж самага корпусу менскія, „тутэйшыя“ тынкары, няўпэўнена спрабуюць „як-жа гэта робіцца? Гадаюць, колькі ўсыпаць мармуру, колькі вугалю, цэманту, вапны, перасыпаюць з скрынкі ў скрынку, робяць ўзоры тынку.

А майстры маскоўцы з гіронічнай ухмылкай праходзяць міма.

— У іх нічога ня выйдзе, хай не стараюцца.

* * *

Тут выступае традыцыйны „майстар з сакрэтам„: Ён заноўвае ад пролетарскай краіны сваю кішэню каб больш ніхто ня ведаў.

Тут сутыкаюцца з абістыя скурныя інтарэсы майстра монополісты і інтарэсы працы, інтарэсы усяе пролетарскай грамады, монополістам ня шкода сапсутага па вопытах матар'ялу, часу.

Ён нікому ня скажа „Як гэта робіцца“. **І. СЛ**

гор. Менск
Унівэрсытэцкі гарадок.

Пляны па здабычы торпу пад пагрозай зрыву

Даць торпстанцыям жывы струмень комсамольскай энэргіі

Кіраўніцтва вопытнай Міхаваўскай торпстанцыі набірала людзей бяз усякіх дакумэнтаў, абы з моцнымі мускуламі, але з вельмі падазронымі соцыяльным становішчам.

Баравік Лявон, Баравік Саўка, Малаш Антось, Паўловіч, Доўнар і інш.—Весь шэраг кулакоў, якія прале́зьлі працаваць на торп. станцыю выключна дзякуючы політычнай бяспаракасьці ле кіраўнікоў. Сем і некаторых з іх высланы за межы Беларусі. Прашэ працаваць на торпстанцыю і сын былога жандарскага стражніка з Самахвалаўскага раёну—Ламко Уладзімер.

Гэты букет клясава-варожых людзей стаў у кіраўніцтве арцеляй і павёў працу па разбурэньню іх. Гэтыя людзі і чалі шкодзіць, зрываць гаспадарча-політычныя мерапрыемствы на торпстанцыі.

Падкулачнік Шкор з кампаніяй пачалі разбураць арцелі тарпянікаў, організоўваць забастоўкі, так забаставалі тарпянікі, і машына № 2 не працавала 4 гадзіны.

„Торпстанцыя—казённая, а значыць—дзяры з яе скуру. Чаго яе шкадаваць?

Яны нас не шкадуюць, высылаюць на Салаўкі і мы іх не пашкадуем."—весь кулацкі дэвіз, поўны клясавай нянавісьці да савецкай ўлады, да соцыялістычнай гаспадаркі. І ня дзіўна, чаму брак часта перавышае палову ўсёй вытворчасьці. Так 28-IV за наўдня выпускаецца 400 цэглін торпу—браку, а за другі дзень—1000. За брак раней таксама аплачвалі, але нарэшце дзесятнік-выдвіжэнец—рабочы—заявіў адміністрацыі што плаціць за брак непатрэбна. Тады ўзьнімаецца справа супроць выдвіжэнца, яму прыпісваюць розныя абвінавачваньні.

Аб шкодніцкіх дзеяньнях кулакоў дамо яшчэ некалькі фактаў. Шкор Антось знарок узарваў трос для конвэеру па перадачы сырцу на поле сушкі, у выніку—дзьве гадзіны прастою. Ён-жа ня выпісвае на тры дні рабочым абеды, а пасьля кажа, што адміністрацыя не дае.

Кіраўніцтва не на сваім месца

Адміністрацыя ігнорує прапановы рабочых, адмаўляецца навялічыць ланцуг конвэера, што дало-б павялічэньне выпрацоўкі продукцыі на 8 проц., а таксама і палягчэньне працы тарпянікаў. Ёсьць і безгаспадарнасьць, так, дзякуючы нядбайству адміністрацыі, здарыўся вялікі абвал кар'еру.

Культасьветнай працы ніякай не праводзіцца. За ўвесь час працы торпстанцыі ня было такога дня, каб была адкрыта чытальня, чырвоны куток. Затое на станцыі ёсьць піва, гарэлка. Кожны вечар—п'янка і скокі да 3-яй гадзіны ночы, а на заўтра—з п'янай галавою на працу. У бараках антысанітарыя, да гэтага часу ня было мэтагляду рабочых, здаровыя сьпяць разам з хворымі. Ніхто на гэта не зьвяртае ўвагі.

Ячэйка ЛКСМБ бяздзейнічае

Працуе на 1-VI каля 120 чалавек, з іх каля 75 проц. моладзі і 60 проц. няпоўналетніх. Аднак, гэтыя падлеткі ставяцца на самую цяжкую працу ў кар'ер разам з дарослымі і там працуюць па 8-10 гадзін у дзень.

Дзяўчаты 15-16 гадовага ўзросту ставяцца таксама на працу з дарослымі і працуюць з-ранку амаль да цямна. Комсамольская ячэйка ніякай працы не праводзіць, яна лічыць, што гэта ня праца. Сэкратар комсамольскай ячэйкі, тав. Войцік, заяўляе:—гэта ня важна, што яны гэтулькі працуюць.

Прарывы ў выкананьні плянаў

Сэзон торпстанцыя сустрэла непадрыхтаванай. Да гэтага часу намечаныя праэкты не праведзены ў жыцьцё. Будаўніцтва стаіць на пункце замярзаньня. Тарпянікам, прыехаўшым з другіх акруг, з другіх раёнаў,—няма куды дзецца. Пад агульнажыцьці тарпянікаў забралі чырвоны куток і тыя памяшканьні, дзе раней стаяла жывёла. У выніку ўсіх гэтых фактаў мы маем прарывы ў галіне здабычы торпу. Торпстанцыя ў гэтым годзе павінна здабыць 7 мільёнаў цэглы, аднак, па тых тэмпах працы, якія мы зараз маем, можна сказаць, што здабыча торпу будзе правалена.

Замест намечанай прамфінплянам вытворчасьці працы кожнай арцелі ў 30 тысяч цэглы ў дзень, мы сёньня маем усяго 15 тысяч. Максымум—17 тысяч 500 (і то ў гэты лік уваходзіць брак). Заказы, якія ўзяла торпстанцыя, ня выконваюцца. Напрыклад, да 15-га трэба было здаць ваенведу торп на подсьціл. Аднак, на сёньняшні дзень ня выкапалі і 1 дзесятай часткі заказу. Людзі з кіраўніцтва ведаюць аб прарывах, але іх змазваюць.

* * *

Торп набывае асабліва вялікае значэньне; торп патрэбен для апалу фабрык заводаў, для індустрыялізацыі Беларусі. Да торпу патрэбна ўвага. Пляны, якія намечаны па здабычы торпу,—грандыёзныя. Гэтыя пляны ўносяць сапраўдную рэволюцыю ў пытаньнях апалу.

Комсамольскія ўдарныя брыгады—на фронт торпраспрацовак

Дзьвесьце пяцьдзесят чатыры тысячы тон торпу трэба здабыць на адных толькі плянах безторпу. Тут мы ўжо не гаворым пра іншыя вялікія організацыі па здабычы торпу, як Навуковы Інстытут, Асінторп, Эльвод і шэраг мясцовых прадпрыемстваў і організацый.

Калі ўсюды абстаіць справа з здабычай торпу так, як у Міханавічах, дык загадзя можна сказаць, што пляны па здабычы торпу правалены. Вопыт працы Міханаўскай торпстанцыі аб гэтым яскрава сьведчыць.

Комсамол мае багаты вопыт працы на лесанарыхтоўках і іншых вучастках гаспадарчага фронту. **Комсамолу трэба ўзяцца і за торп.** У нездаровую атмосфэру Міханаўскай торпстанцыі трэба ўліць жывы струмень комсамольскай энэргіі і ініцыятывы. Трэба, каб комсамольскія організацыі мобілізавалі свае сілы на важнейшы вучастак—здабычу торпу. Мы прапануем абгаварыць па ячэйках гэтае пытаньне, і кінуць лепшых комсамольцаў на працу па торпаздабываньню з тым, каб не дапусьціць зрыву плянаў на важнейшым вучастку соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы абавязаны даць ударную комсамольскую брыгаду кожнай торпстанцыі. Гэта ўпаўне магчыма зрабіць, гэта выпаўніма, за гэта гаворыць багаты вопыт працы нашай організацыі.

З. Бакштэйн.

Тэлеграмы

Жорсткія бойкі ў ваколіцах Пэшавару

Ангельская ўлада пусьціла ў ход самалёты і артылерыю

ЛЁНДАН, 8-VI. На працягу ўсяго ўчарайшага дню ў ваколіцах Пэшавару адбываліся бойкі паміж ангельскім войскам і атрадамі афрыдыеў. Пра характар боек можна су-дзіць па тым, што ангельская ўлада прымушана была пусціць у справу самалёты, панцырнікі і артылерыю.

Забастовачны рух у Гішпаніі ўзрастае

ПАРЫЖ. Забастовачны рух у Гішпаніі ўзрастае. У Караліне выбухнула забастоўка гарнякоў. У Малазе бастуюць сельска-гаспадарчыя рабочыя. У Білібао—шкляры. Шэраг забастовак скончылася перамогаю рабочых.

Пазыка на ўзбраеньне

БЭРЛІН. Югаславія атрымала пазыку ў 1 мільярд фіакраў (фіакр—3 кап.) на набыцьцё вайсковых прылад у Францыі і Чэхаславакіі. У лік пазыкі ў Югаславію прыслана ўжо 300 вайсковых самалётаў.

Тэрор белагвардзейскіх банд узмацніўся

ТОКІЕ, 8-6. Тэрор белагвардзейскіх банд. якія апэруюць у раёне Хайлару Чжаромту і Ядэшы, узмацніўся. У пасёлку Шінішан белагвардзейцы абрабавалі і забілі 20 кітайцаў.

Забастоўка мэталёўцаў у Гэнце

ПАРЫЖ. У Гэнце (Бэльгія) забаставала 4500 мэталёўцаў у знак пратэсту супроць адмены прадпрымцамі прыбаўкі на дарагоўлю.

Хваляваньні тытунёўцаў ня спыняюцца

ВЕНА. Хваляваньні тытунёўцаў у Кавалі (буйны тытунёвы цэнтр Грэцыі) ня спыняюцца. У горадзе адбываюцца масавыя дэманстрацыі і сходы пратэсту супроць скарачэньня рабочых і зьніжэньня заработку.

Паветраная карная экспэдыцыя ангельскага „рабочага" ураду бомбардзіравала індыйскія вёскі.

Ня гледзячы на ахвяры, рух „чырвоных сарочак" працягвае шырыцца.

(З газэт).



Макдональд:—Хто адважыцца раўняць нас з імпэрыялістымі... Мы вышэй усялякіх падазрэньняў!..

Крывавыя падзеі ў Пхулане

ПАРЫЖ. 5 чэрвеня ў Пхулане (Кахінтына) здарыліся крывавыя падзеі. У двух вёсках тубыльская варта распачала страляць па дэманстрантах. Двое дэманстрантаў забіта, 17 паранена.

Работу „Ч.З."—пад агонь самакрытыкі

5-га чэрвеня ў горадзе Бабруйску, у клюбе Дрэваапрацоўчнікаў, адбылася агульна-гарадзкая конфэрэнцыя чытачоў газэты „Чырвоная Зьмена".

Даклад аб рабоце рэдакцыі „Ч. З." зрабіў прадстаўнік ад рэдакцыі тав. Ашаровіч.

У працы конфэрэнцыі ўдзельнічала звыш 500 чалавек.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы асабліва завастралі пытаньні неабходнасьці неадкладнага палепшаньня кіраўніцтва юнкораўскім рухам з боку рэдакцыі, разгортваньня масавай работы вакол газэты ў комсамольскіх ячэйках і прадпрыемствах гораду Бабруйску, 100 процантнай падпіскі на газэту і г. д.

На конфэрэнцыі шырока разгарнулася здаровая самакрытыка. У спрэчках выказалася звыш 15 чалавек моладзі з буйнейшых прадпрыемстваў гораду Бабруйску.

Конфэрэнцыя чытачоў выказалася за абсолютную неабходнасьць хутчэйшага павялічэньня фармату газэты і прыняла рад практычных прапаноў аб організацыі штодзённай масавай работы з газэтай.

Конфэрэнцыя чытачоў паслала прывітальную тэлеграму XIII зьезду КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і яго II органу газэце „Чырвоная Зьмена".

М.

Юнкоры пішуць

Бібліотэка пры Стара-Дарожскім лесазаводзе „Пролетары" зусім не працуе. Комсамольская ячэйка толькі выдзеліла бібліотэкара, але не дапамагае ў яго працы і не цікавіцца як ён працуе.

М. ШВАНКОЎ.

* * *

Праца сярод жанчын ібатрацтва па Пухавіцкім раёне амаль не праводзіцца. Ня было ніводнага сходу жанчын па пытаньням колектывізацыі. А бываюць выпадкі, калі жонкі бяруць развод і не даюць маемасьці таму мужу, які ідзе ў колгас.

Партыйныя ячэйкі гэтым пытаньнем не займаліся, выдучаныя для працы сярод жанчын паасобныя партыйцы і комсамольцы лічаць гэтую працу непатрэбнай і абсолютна нічога не робяць.

Належыць неабходна партыйным ячэйкам як сьлед заняцца гэтым пытаньнем.

КАЛІНА.

* * *

Стара-Дарожская (Бабруйшчына) пошта адсылае на вёскі газэты праз два-тры дні пасьля іх атрыманьня. Пакуль-жа яны рэйдуць праз усе „кольцы", праходзіць цэлы тыдзень. Газэту „Чырвоная Зьмена" чытачы атрымліваюць па 3-4 нумары адразу і прытым з спазьненьнем па тыдзень

Юнкор А. Б. В.

* * *

За апошні час ахова працы на „Чырвонай Бярэзіне" (Барысаў) пастаўлена дрэнна. Гэта можна сьцьвердзіць лічбамі няшчасных выпадкаў. З 1-III—29 года па 1-III—30 г. мы маем 382 няшчасных выпадкі.

Ня лепш і на „Пролетарскай Перамозе", дзе да гэтага часу не ўстаноўлена вэнтыляцыя нават у такіх цэхах, як аўтоматычны і шчапальны. Дзесяткам па падачы паліва да гэтага часу ня выдаюць спэц-вопраткі. У цэхах няма плявальніц, бакаў для вады зусім не вымываюць.

Юнкор ВАШ

* * *

Яўрэйскае насельніцтва в. Дукора, дзе нядаўна адбыўся вялікі пажар, на агульным сваім сходзе пастанавіла пабудаваць агульны жылы дом. Ужо прыняліся за пабудову гэтага дому

КУНІЦКІ.

Занятк фізкультуры ў школах соцвыху

Бюро фізкультуры пры НКЗА пастанавіла ўвесьці ў школах соцвыху спэцыяльныя гадзіны заняткаў па фізкультуры для слабасільных вучняў.

110000 падлеткаў будзе прынята ў ФЗВ

МАСКВА; 5. Увосень у школах фабзавучу будзе прынята звыш 110000 падлеткаў.

Сёньня нарада актыву Кастрычнікаўскай арганізацыі

9 чэрвеня, а 6 г. палов. гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу „Розы Люксэмбург" (вуліца Урыцкага і Карла Маркса) адбудзецца пашыраны сход актыву ЛКСМБ Кастрычнікаўскага раёну.

Яўка абавязкова. Білеты можна атрымаць у РК.

Правілы прыёму

ў менскую 2-гадовую школу мэдычных сёстраў ЦК Чырвонага Крыжу БССР

У школу прымаюцца асобы ўзростам ад 17 да 30 год.

Скончыўшыя 7-мігодку, школу дарослых павышанага тыпу агульна-асьветныя курсы і школу былай сялянскай моладзі на базе 4-годкі, прымаюцца бяз іспытаў.

УВАГА: У адносінах работніц, батрачак, санітарак, адукацыйны цэнз для прыёму зьніжан да 5-цігодкі.

Школа прымае ў гэтым годзе 150 асоб, месцы разьмяркованы па акруговых к-тах Чырвонага Крыжу, куды жадаючыя павінны падаваць наступныя дакумэнты:

1) Дакумэнт аб узросьце (мэтрыка);
2) „ „ асьвеце;
3) 2 фотографічныя карткі;
4) Мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага;
5) Дакумэнт, які сьведчыць аб матар'яльным і соцыяльным становішчы паступаючага, яго бацькі да і пасьля рэволюцыі;
6) Даведка, засьведчаная ніжэйшай савецкай організацыяй, аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых праў;
7) Для сялян—акладны ліст на 1929-30 г., а для саматужнікаў—патэнт;
8) Анкету, засьведчаную профэсыянальнымі або савецкімі організацыямі.

Тэрмін прыёму заяў з 1 чэрвеня па 25 ліпеня, пасьля чаго дакумэнты адобраных акругамі кандыдатур перасылаюцца ў цэнтральную адборачную камісію пры ЦК Чырвонага Крыжу БССР

Аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы індывідуальна.

Брыгада па популярызацыі беларускай народнай песьні

Гэтымі днямі беларускі радыёцэнтр разам з Галоўмастацтвам БССР камандыруе ў паездку па Беларусі брыгаду з мэтай популярызацыі беларускай народнай песьні. Прымаючы пад увагу, што за ўвесь час такіх концэртных паездак па Беларусі ня было, а таксама і тое, што працоўныя Беларусі ня ведаюць яшчэ новых колгасных і рэволюцыйных сьпеваў гэта паездка набывае выключнае значэньне. Грамадзкі прагляд рэпэртуару концэртнай брыгады адбудзецца 10-га гэтага месяца а 12-ай гадзіне, у памяшканьні радыё-цэнтру. На прагляд запрашаюцца прадстаўнікі рэдакцыі газэт, профэсыйных і партыйных організацый.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599